лагаўчан да ўнікальнагат куточка свайго раёна, цікавасці жыхароў Беларусі да гісторыі падобных мясцін, прыцягненню ўвагі міжнароднай супольнасці да канкрэтных праяў народнага хрысціянства ў нашай краіне.

*Вольга Лабачэўская*

## ГАНЧАРНАЕ РАМЯСТВО І ПРОМЫСЕЛ ВЁСКІ ГАРАДНАЯ СТОЛІНСКАГА РАЁНА БРЭСЦКАЙ ВОБЛАСЦІ: ПРАБЛЕМА ЗАХАВАННЯ І РАЗВІЦЦЯ

Вёска Гарадная Столінскага раёна Брэсцкай вобласці славутая сваім ганчарным промыслам, які бярэ пачатак у XV стагоддзі. Першая літаратурная згадка пра Гарадную адносіцца да 1448 года. У мінулым Гарадная мела статус мястэчка і валодала Магдэбургскім правам і ўласным гербам. Сёння вёска Гарадная – цэнтр сельскага савета.

Багатыя радовішчы гліны і навакольныя лясы, а разам з тым бедная глеба, мала прыдатная для земляробства, малазямелле мясцовых сялян садзейнічалі развіццю ў Гараднои ганчарнага промыслу, які на працягу некалькіх стагоддзяў быў асноўным занятkам мясцовага насельніцтва. Ганчарныя вырабы з Гараднои, за якімі трывала замацавалася назва «гараднянскія», у XIX стагоддзі разыходзіліся па ўсяму Цэнтральнаму і Усходняму Палессю, траплялі ў Кіеў, Вільню, Варшаву. У пачатку XX стагоддзя ганчарным промыслам у Гараднои займалася больш за 200, а ў 1920-1930-я гады – каля 500 сем'яў.

Да нашага часу ганчарны промысел у Гараднои існуе ў сваім аўтэнтычным стане. Тут захавалася традыцыйная тэхналогія апрацоўкі гліны, вырабу посуду на нажных ганчарных колах і яго апалу, існуе мясцовая метралогія – сістэма назваў ганчарных форм. Традыцыйны гараднянскі посуд мае буйныя, шарападобныя формы, дасканалыя прапорцыі. Найбольш характэрны – белагліняны посуд з выразным дэкорам (роспісам чырвонай глінай – ангобам).

З пачатку XX стагоддзя гарадняская кераміка ў якасці твораў народнага мастацтва пачала дэманстравацца на выстаўках. У 1911 годзе этнограф Ісак Сербаў задакументаваў на фотаздымках працэс мясцовай ганчарнай вытворчасці посуду на ганчарным коле, ганчароў з сям'і Мірановічаў і Яромічаў. У перыяд 1920-1930-х гадоў гараднянская кераміка зрабілася прадметам навуковай цікавасці і музейнага калекцыяніравання. У гэты час дзеячы народных промыслаў у Польшчы рабілі арганізацыйныя намаганні па ўдасканаленню ганчарнай вытворчасці, навучанню майстроў, арганізацыі вытворча-гандлёвых кааператываў. У 1936 годзе польскімі кінадакументалістамі студыі

«Авангард» была знята дакументальная кінастужка «Гараднoe – мястэчка гліняных гаршчкоў» (не захавалася).

У пасляваенны час ганчарная вытворчасць у Гараднoй пачала імкліва скарачацца. Гэта было выклікана забаронай у СССР на індывідуальнае прадпрымальніцтва, высокімі падаткамі, дэмаграфічнымі зрухамі і адтокам маладога пакалення з вёскі ў горад. Не далі плёну спробы Пінскай фабрыкі мастацкіх вырабаў на супрацоўніцтва з гараднянскімі ганчарамі ў 1970-я гады. Разам з тым у перыяд 1970-1990-х гадоў рамяство гараднянскіх ганчароў было асэнсавана ў якасці набытку нацыянальнай культуры і мастацтва. Вырабы ганчароў Аляксандра Вячоркі, Фёдара Шэлеста, Івана Яроміча, Аўрама Басаўца, Андрэя Кісяля, Івана Гембіцкага дэманстраваліся на шматлікіх выстаўках у Беларусі, Маскве і ў замежжы. У 1992 годзе Рэспублікай Беларусь была выпушчана паштовая марка з выявай гараднянскага посуду. На Першым рэспубліканскім свяце-конкурсе «Гліняны звон» у 1996 годзе майстрам года быў абраны гараднянскі ганчар Мацвей Пячонка. У 2004 годзе патомны ганчар Аўрам Басавец атрымаў спецыяльную прэмію Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва.

З канца 1990-х гадоў шэраг захадаў па падтрымцы гараднянскага промыслу зрабілі ўстановы культуры Брэсцкай вобласці. У 2000 годзе Брэсцкі абласны грамадска-культурны цэнтр падрыхтаваў відэафільм аб ганчарстве Гараднoй «Кола жыцця». У 2003 годзе па рашэнні Столінскага райвыканкама ў Гараднoй быў створаны Цэнтр ганчарства. Ён размешчаны ў памяшканні Гараднянскага сельскага Дома культуры. Тут рамяству навучаюцца мясцовыя школьнікі, якім ганчарную справу выкладаюць патомныя ганчары.

У 2008 годзе ў Гараднoй па ініцыятыве Брэсцкага абласнога грамадска-культурнага цэнтра адбыўся Першы Міжнародны ганчарны пленэр, які меў на мэце прыцягнуць увагу грамадскасці да праблемы захавання і патрымкі гэтага унікальнага ганчарнага цэнтра. У 2010 годзе Брэсцкім абласным упраўленнем культуры было запланавана правядзенне у Гараднoй Другога Міжнароднага ганчарнага пленэру. Столінскім аддзелам культуры пры падтрымцы міжнароднага фонду быў ажыццёўлены праект «Захаванне і развіццё ганчарнага промыслу на тэрыторыі Гараднянскага сельскага савета», які быў накіраваны на падтрымку і развіццё ганчарнага промыслу праз навучанне рамяству маладога пакалення, уключэнне гэтага цэнтра ў турыстычныя маршруты. У выніку ў Гараднoй была набыта хата і створаны дом-музей «Хата ганчара» у якасці філіяла Столінскага раённага краязнаўчага музея.

Разам з тым існаванне гараднянскага ганчарнага цэнтра знаходзілася пад небяспекай знікнення. Сітуацыя у Гараднoй вызначалася наступным чынам: гэта апошні момант існавання мясцовага аўтэнтычнага ганчарнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рамяства і ўнікальнага па сваёй былой значнасці, памерам, формам арганізацыі ганчарнага цэнтра.

У Гараднoй заставалася сем апошніх патомных ганчароў з дынастый Кісялёў, Басаўцоў, Мірановічаў, Кавалько і інш. (а ўсяго 13 ганчароў разам з маладымі). Усе яны людзі вельмі сталага ўзросту, нарадзіліся ў канцы 1920-х – пачатку 1930-х гадоў. Майстры з'яўляюцца носьбітамі традыцыйных для Гараднoй рамесных ведаў і навыкаў, сакрэтаў тэхналогіі апрацоўкі матэрыялу, мастацкіх прыёмаў стварэння ганчарных формаў і іх апрацоўкі. Старэйшае пакаленне гараднянцаў карыстаецца ў зносінах унікальнай мясцовай гаворкай, якую лінгвісты лічаць вельмі старажытнай. Яна захоўвае памяць вуснай гісторыі пра асаблівасці жыцця ў Гараднoй у XX стагодзі, формы вырабу і гандлю ганчарным посудам, яго мясцовыя назвы, а таксама шмат чаго іншага. Усё гэта патрабуе тэрміновай фіксацыі, дакументацыі сучаснымі тэхнічнымі сродкамі (лічбавае відэа, фота, аудыё).

Другая праблема заключаецца ў пошуку і прафесійнай распрацоўцы дзейсных захадаў па захаванні ганчарства ў Гараднoй. Для існавання ганчарнага цэнтра гэта павінна адбывацца не толькі ў форме навучання моладзі, а таксама ў стварэнні і развіцці сучаснай вытворчасці ганчарнага посуду на падставе выкарыстання рарытэтнай па захаванасці тэхналогіі, але з ужываннем неабходных тэхналагічных удасканаленняў і арганізацыі працы.

Трэцяя праблема, вырашэнне якой паспрыяе падтрымцы Гараднoй як унікальнага лакальнага гісторыка-культурнага цэнтра, – яго ўключэнне у інфраструктуру рэспубліканскага і міжнароднага турызму.

У сувязі з гэтым рэкамендавана Рэспубліканскай навукова-метадычнай радзе па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь надаць *традыцыйнаму ганчарнаму рамяству і промыслу вёскі Гараднoй Столінскага раёна Брэсцкай вобласці статус нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці,* паколькі гэта будзе спрыяць прыцягненню ўвагі дзяржаўных устаноў, культурнай грамадскасці, прадпрымальнікаў, навукоўцаў да вырашэння праблем падтрымкі, захавання і развіцця вёскі Гараднoй як гістарычнага цэнтра унікальнага ганчарнага рамяства і промыслу, значэнне якога ва ўмовах імклівага развіцця сучасных працэсаў уніфікацыі і глабалізацыі культуры мае не толькі нацыянальны узровень, але і міжнародны. Важным крокам з'яўляецца распрацоўка дасье у ЮНЕСКО для унясення традыцыйнага ганчарнага рамяства і промыслу вёскі Гарадная ў спіс знікаючых аб'ектаў нематэрыяльнай культурнай спадчыны, і патрабуюць тэрміновай аховы.

РЭПОЗИТОРИЙ БГУКИ